# Указ

# Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь

6 студзеня 2022 г. № 6 г.Мінск

Аб прысуджэнні спецыяльнай прэміі
Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь

1. За выдатныя дасягненні ў галіне музычнага, выяўленчага, дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, журналістыкі, народнай і аматарскай мастацкай творчасці, навучання і выхавання творчай моладзі, якія атрымалі грамадскае прызнанне, прысудзіць спецыяльную прэмію Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзеячам культуры і мастацтва 2021 года:

аўтарскаму калектыву ў складзе Гладкай Людмілы Леанідаўны, аглядальніка рэдакцыі аддзела палітычнай інфармацыі ўстановы Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ”Выдавецкі дом ”Беларусь сегодня“, Карповіча Алега Іванавіча, аглядальніка аддзела падрыхтоўкі ілюстрацый упраўлення аб’яднанага сакратарыята ўстановы Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ”Выдавецкі дом ”Беларусь сегодня“, Цераховіча Юрыя Леанідавіча, генеральнага дырэктара таварыства з абмежаванай адказнасцю ”Тэхнагруп“, – за значны ўклад у развіццё беларускай журналістыкі, стварэнне цыкла публікацый па актуальных пытаннях грамадска-палітычнага жыцця краіны;

Громаву Уладзіміру Валер’евічу, артысту-вакалісту (салісту) – вядучаму майстру сцэны дзяржаўнай тэатральна-відовішчнай установы ”Нацыянальны акадэмічны Вялікі тэатр оперы і балета Рэспублікі Беларусь“, народнаму артысту Беларусі, – за стварэнне высокамастацкіх вобразаў у прэм’ерных спектаклях Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Рэспублікі Беларусь;

заслужанаму аматарскаму калектыву Рэспублікі Беларусь народнаму ансамблю танца ”Крыжачок“ Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта – за значны ўклад у захаванне традыцый харэаграфічнага мастацтва, актыўны ўдзел у грамадска-культурным жыцці краіны;

заслужанаму аматарскаму калектыву Рэспублікі Беларусь узорнаму тэатру эстрады ”Капелька“ Мірскага сельскага Дома культуры дзяржаўнай установы культуры ”Баранавіцкая раённая клубная сістэма“ – за значны ўклад у выхаванне творчай моладзі, паспяховы ўдзел у рэспубліканскіх і міжнародных конкурсах і фестывалях;

заслужанаму калектыву Рэспублікі Беларусь Прэзідэнцкаму аркестру Рэспублікі Беларусь дзяржаўнай установы ”Палац Рэспублікі“ Кіраўніцтва справамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь – за значныя дасягненні ў развіцці эстраднага мастацтва, рэалізацыю музычных праектаў у рамках Года народнага адзінства;

Казачку Васілію Андрэевічу, загадчыку філіяла № 15 Цэнтра ганчарства в.Гарадная дзяржаўнай установы культуры ”Столінская раённая клубная сістэма“, – за значны асабісты ўклад у захаванне традыцый ганчарнага рамяства;

калектыву ўстановы адукацыі ”Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў“ – за значны ўклад у патрыятычнае выхаванне моладзі, рэалізацыю грамадска-культурных праектаў;

Клімко Наталлі Аляксандраўне, кіраўніку народнага аматарскага калектыву Рэспублікі Беларусь клуба майстроў народнай творчасці ”Каляровая альтанка“ Навагрудскага раённага Цэнтра рамёстваў дзяржаўнай установы культуры ”Навагрудскі раённы цэнтр культуры і народнай творчасці“, – за плённую працу па захаванні традыцый вырабу беларускай выцінанкі;

Нацыянальнаму алімпійскаму камітэту Рэспублікі Беларусь – за арганізацыю і правядзенне спартыўна-культурнага фестывалю ”Вытокі. Крок да Алімпу“, накіраванага на папулярызацыю здаровага ладу жыцця, умацаванне сямейных каштоўнасцей і захаванне нацыянальных традыцый.

2. Міністэрству культуры ажыццявіць выплату спецыяльных прэмій Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзеячам культуры і мастацтва 2021 года са сродкаў фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы культуры і мастацтва.

3. Вызваліць сумы прэмій, атрыманых у адпаведнасці з дадзеным Указам, ад абкладання падаходным падаткам з фізічных асоб.

4. Дадзены Указ уступае ў сілу з дня яго падпісання.

Прэзідэнт
Рэспублікі Беларусь А.Лукашэнка

АДМИНИСТРАЦИЯ ПРЕЗИДЕНТА РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ • 1 • Для правовых актов

10